# У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ – ПЕДАГАГІЧНАЯ АДУКАЦЫЯ

15 чэрвеня ў нашай альма-матар адбылося пасяджэнне Каардынацыйнага савета па пытаннях бесперапыннай педагагічнай адукацыі. На гэта мерапрыемства сабраліся кіраўнікі шматлікіх вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь, Полацкага і Аршанскага каледжаў, сярэдніх школ.

На парадку дня разглядалася некалькі важных пытанняў. Так, пра дзейнасць Віцебскага рэгіянальнага кластара педагагічнай адукацыі расказаў прарэктар па вучэбнай рабоце нашага ўніверсітэта Веслаў Іосіфавіч Туркоўскі. Рэктар БДПУ імя Максіма Танка, старшыня Каардынацыйнага савета Аляксандр Іванавіч Жук распавёў, як можна выкарыстоўваць прыярытэтныя напрамкі псіхолага-педагагічных даследаванняў у сферы адукацыі ў працэсе фарміравання праграм навуковых даследаванняў, тэматыкі магістарскіх, кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый, навукова-даследчай работы кафедраў, курсавых і дыпломных работ студэнтаў.

Цікавым было выступленне начальніка Цэнтра развіцця педагагічнай адукацыі БДПУ імя Максіма Танка, сакратара Каардынацыйнага савета Аляксандры Валянцінаўны Пазняк. Яна прааналізавала вынікі рэспубліканскага анкетавання выпускнікоў педагагічных класаў 2016/2017 навучальнага года.

Трэба адзначыць, што на сённяшні дзень у Рэспубліцы Беларусь створана 300 класаў педагагічнай накіраванасці, у якіх навучаюцца 3,5 тыс. школьнікаў. Упершыню выпускнікі гэтых класаў будуць паступаць на педагагічныя спецыяльнасці без экзаменаў. А.І. Жук падкрэсліў, што гэта вельмі добра, калі выпускнікі сярэдніх школ мэтанакіравана ідуць у педагогіку. Сёння настаўнік з'яўляецца цэнтральнай фігурай у нашым грамадстве. Ён выхоўвае, фарміруе моладзь. І ад таго, наколькі якасна педагог будзе выконваць сваю працу, залежыць будучае нашай дзяржавы. Былі разгледжаны і іншыя пытанні, па кожным з якіх было прынята адпаведнае рашэнне.









Кульмінацыяй пасяджэння Каардынацыйнага савета стала падпісанне дагавора аб супрацоўніцтве БДПУ імя Максіма Танка з нашай ВНУ. Гэты дакумент прадугледжвае ўзаемадзеянне ўстаноў у акадэмічнай, навуковай і сацыякультурнай сферах. Напрыклад, запланаваны распрацоўка і рэалізацыя сумесных адукацыйных праграм, выкананне навуковых даследаванняў, правядзенне спартыўных і культурных мерапрыемстваў і шмат чаго іншага. Усё гэта будзе спрыяць павышэнню якасці прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў педагагічнай адукацыі.

**НАШ КАР.**

**На здымках:** падчас пасяджэння Каардынацыйнага савета па пытаннях бесперапыннай педагагічнай адукацыі. **Фота Н. ЛАЗЕБНАЙ і А. КОЛЫЧАВА.**

**P.S.** Для ўдзельнікаў пасяджэння супрацоўнікамі бібліятэкі нашага ўніверсітэта была падрыхтавана выстава навуковых работ выкладчыкаў. Сваімі дасягненнямі падзяліліся Полацкі і Аршанскі каледжы, а таксама факультэты нашай ВНУ. Вынікі сваёй творчасці прадэманстравалі студэнты мастацка-графічнага факультэта. Хлопцы і дзяўчаты педагагічнага факультэта зладзілі цікавы канцэрт.